## Наш край у перыяд ранняга Новага часу

**1.** Складзіце спіс крыніц, з якіх можна пачарпнуць інфармацыю пра гістарычнае развіццё вашай мясцовасці ў перыяд ранняга Новага часу (XVI–XVIII стст.).

**2.** Якія экспанаты, што адносяцца да ранняга Новага часу, захоўваюцца ў краязнаўчых музеях вашай мясцовасці? Пра што яны сведчаць?

**3.** Вывучыце, якія звесткі змяшчае кніга «Памяць» вашага раёна пра развіццё мясцовасці і жыццё яе насельніцтва ў XVI–XVIII стст. Структуруйце знойдзеную інфармацыю ў адной з формаў: інфаграфіка, ментальная карта, плакат і інш.

**4.** Карыстаючыся картасхемамі з навучальнага дапаможніка, картамі атласа або насценнымі картамі, выканайце заданні.

**А.** Прасачыце, як з другой паловы XVI да канца XVIII ст. мяняўся адміністрацыйны статус рэгіёна, у якім вы жывяце. У склад якіх адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак уваходзіў ваш населены пункт?

**Б.** Пералічыце найбольш значныя падзеі, якія адбываліся на тэрыторыі вашай мясцовасці ў XVI–XVIII стст. Падрыхтуйце паведамленне пра адну з іх.

**В.** Ахарактарызуйце сацыяльна-эканамічнае развіццё вашай мясцовасці (асноўныя заняткі насельніцтва, развіццё гандлю і шляхоў зносін, асаблівасці мануфактурнай вытворчасці і да т. п.) у дадзены гістарычны перыяд.

**5.** Вылучыце асаблівасці канфесійных адносін жыхароў вашай мясцовасці ў XVI–XVIII стст. Якія рэлігійныя працэсы аказалі на іх найбольшы ўплыў?

**6.** Якія падзеі адбываліся на тэрыторыі вашага рэгіёна ў часы падзелаў Рэчы Паспалітай? Як яны паўплывалі на наступнае развіццё?

**7.** Устанавіце імёны гістарычных дзеячаў, у тым ліку ўраджэнцаў вашага краю, якія зрабілі значны ўнёсак у эканамічнае, палітычнае, культурнае развіццё вашай малой радзімы. Падрыхтуйце кароткае паведамленне пра аднаго з іх.

**8.** Наведаўшы мясцовы гістарычны і/або краязнаўчы музей, а таксама выкарыстоўваючы матэрыялы анлайн-рэсурсаў, складзіце спіс помнікаў культуры, якія былі створаны ў вашым рэгіёне ў XVI–XVIII стст. Якія з іх захаваліся да нашых дзён? Распрацуйце турыстычны маршрут для гасцей вашага раёна або горада.